Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М.Машэрава”

**Шаноўныя калегі!**

Запрашаем вас прыняць удзел у працы IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі

**“БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА Ў СЛАВЯНСКІМ ЭТНАКУЛЬТУРНЫМ КАНТЭКСЦЕ”,**

якая адбудзецца **23-24 кастрычніка 2024 года** ва ўстанове адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”.

**Мэта канферэнцыі:**

Абмен навукова-даследчым вопытам ў сферы ўзаемаадносін мовы, літаратуры і нацыянальнай культуры, выпрацоўка рэкамендацый па выкарыстанні беларускай мовы і літаратуры ў сферы культурнага жыцця, адукацыі і гуманітарнай бяспекі беларускай дзяржавы.

На канферэнцыі плануецца абмеркаванне наступных праблем:

- Агульнанацыянальныя і рэгіянальныя моўныя працэсы ў камунікатыўнай прасторы Беларусі.
- Беларуская мова як нацыянальна-культурны феномен у сінхраніі і дыяхраніі.
- Сучасныя праблемы этналінгвістыкі, сацыялінгвістыкі, лінгвакраіназнаўства і лінгвакультуралогіі.
- Мова і стыль мастацкага і публіцыстычнага дыскурсу.
- Беларуска-іншаславянскія моўныя і літаратурныя сувязі.
- Беларускі літаратурны працэс: гісторыя, сучаснасць, перспектывы.
- Жанрава-стылёвыя тэндэнцыі сучаснай літаратуры.
- Гістарычна-культурны аспект развіцця славянскіх літаратур.
- Метадычныя аспекты выкладання беларускай мовы і літаратуры ў ВНУ і сярэдняй школе.
- Першы крок у навуку: секцыя маладых даследчыкаў.

Рабочыя мовы канферэнцыі: **беларуская, руская.**

Форма ўдзелу – вочная, завочная. Магчыма дыстанцыйнае падключэнне.

Для ўдзелу ў рабоце канферэнцыі неабходна строга да **25 верасня 2024 года** прайсці **рэгістрацыю** па спасылцы **https://conf.vsu.by.** Пры рэгістрацыі патрэбна прымацаваць (у выглядзе далучаных файлаў) заяўку на ўдзел у канферэнцыі (гл. **Узор афармлення заяўкі**) і тэкст матэрыялаў.

Аб атрыманні матэрыялаў аргкамітэт паведаміць у лісце на ўказаны пры рэгістрацыі электронны адрас.

Калі на працягу трох дзён пацвярджэнне не прыйшло, просім прадубліраваць заяўку і матэрыялы на электронны адрас: **kbelyaz@vsu.by** або звярнуцца да каардынатараў канферэнцыі.

Да пачатку работы канферэнцыі плануецца выданне зборніка навуковых артыкулаў. Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору матэрыялаў да друку і іх рэдагавання. Выданне зборніка плануецца да пачатку канферэнцыі.

Прынятыя да апублікавання матэрыялы друкуюцца бясплатна. Праезд, пражыванне, харчаванне – за кошт удзельнікаў канферэнцыі.

## Патрабаванні да афармлення матэрыялаў даклада

Матэрыялы даклада аб'ёмам не менш за 5 старонак фармату А4 набіраецца ў тэкставым рэдактары Microsoft Word з расшырэннем .doc (.docx) або .rtf. Міжрадковы інтэрвал – адзінарны; усе палі – 25 мм; абзац – 1,25; шрыфт – Times New Roman. Для асноўнага тэксту ўжываецца кегль 14 пт, для літаратуры – 12 пт. Ілюстрацыйны матэрыял друкуецца курсівам, пры неабходнасці выдзяляецца тлустым шрыфтам. Схемы, табліцы, малюнкі ўстаўляюцца ў тэкст.

На першым радку справа друкуюцца ініцыялы і прозвішча аўтара; на наступным радку – назва ўстановы, у якой падрыхтаваны даклад; на наступным радку злева – тэматычны рубрыкатар УДК. Праз радок вялікімі тлустымі літарамі ўказваецца назва даклада з выраўніваннем па цэнтры. Праз радок – курсівам ключавыя словы (5-7 слоў), на наступным радку – курсівам анатацыя на мове артыкула (3-4 сказы).

Тэкст артыкула друкуецца праз радок. Спасылкі на літаратуру афармляюцца ў квадратных дужках з указаннем нумара крыніцы ў спісе літаратуры і нумара старонкі, напрыклад: [1, с. 55]. Спіс літаратуры, афармлены ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК, друкуецца ў алфавітным парадку праз радок пасля тэксту артыкула.

Пасля спіса літаратуры праз радок **на англійскай мове** друкуюцца ініцыялы і прозвішча аўтара, назва ўстановы, даклада, ключавыя словы, анатацыя (гл. **Узор афармлення артыкула**).

## Узор афармлення артыкула

**І.І. Іваноў**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава

УДК

**НАЗВА ДАКЛАДА**

*Ключавы словы: анамастыка, ...*
*Анатацыя на мове артыкула…*

Тэкст.......................................................................................................
......................................................................................................................
......................................................................................................................

**Літаратура**

1. Лепешаў, І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ / І.Я. Лепешаў. – Гродна: ГрДУ, 2002. – 207 с.

**I.I. Ivanov**
Vitebsk State University named after P.M. Masherov

**Назва артыкула на англійскай мове**

*Ключавы словы на англійскай мове: onomastika, ...*
*Анатацыя на англійскай мове…*

## Узор афармлення заяўкі

**Заяўка**
на ўдзел у IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі
“Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце”

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара(ў)
2. Месца работы
3. Пасада
4. Вучоная ступень, званне
5. Назва артыкула
6. Адрас дакладчыка
7. Тэлефон
8. E-mail
9. Форма ўдзелу (вочная / завочная)
9. Неабходнасць браніравання месца ў гасцініцы ці інтэрнаце
10. Дата

**Адрас аргкамітэта:**

Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, факультэт гуманітарыстыкі і моўных камунікацый, кафедра беларускай і рускай філалогіі, Маскоўскі пр-т, д. 33, аўд. 607а, 609; 210038, г.Віцебск, Віцебская вобласць, Рэспубліка Беларусь.

Тэлефон: + 375 212 37-09-13.

**Каардынатары канферэнцыі:**

Бабіч Юрый Міхайлавіч – дацэнт кафедры беларускай і рускай філалогіі, кандыдат філалагічных навук. Тэл. +375 29 308-49-78 (А1).

Падстаўленка Віталь Феліксавіч – дацэнт кафедры беларускай і рускай філалогіі, кандыдат філалагічных навук. Тэл. +375 25 762-26-92 (Life).

**Сакратар канферэнцыі:**

Гудкова Надзея Васільеўна – спецыяліст па суправаджэнні вучэбнага працэсу кафедры беларускай і рускай філалогіі. Тэл. +375 29 718-23-20 (МТС).